# НАРОДНЫ СТАРАСТА

**Да 75-годдзя з дня нараджэння А. Р. ЧАРВЯКОВА**

Выдатны дзяржаўны і партыйны дзеяч Аляксандр Рыгоравіч Чарвякоў нарадзіўся 8 сакавіка 1892 года ў вёсцы Дукарка, што на Міншчыне. Бацька яго быў малазямельны селянін, працаваў у панскім маёнтку, а потым у пошуках лепшай долі падаўся ў горад. Як ні цяжка яму было, але ўсё ж ён даў магчымасць сыну скончыць царкоўна-прыходскую школу і гарадское вучылішча.

На гэтым дапытлівы юнак не спыніўся. Ён вытрымаў экзамен на званне настаўніка. Пачаў працаваць у вясковай школе Трокскага павета Віленскай губерні. Адначасова паступіў у Віленскі настаўніцкі інстытут, які скончыў у 1915 годзе.

Восенню таго ж года Аляксандра Рыгоравіча мабілізавалі ў царскую армію, накіравалі ў запасны полк, потым — у ваеннае вучылішча. Праз некалькі месяцаў А. Р. Чарвякоў ужо ў чыне прапаршчыка зноў у запасным палку. Тут ён прымае ўдзел у рабоце рэвалюцыйных гурткоў.

У пачатку 1917 года, перад адпраўкай на фронт, А. Р. Чарвякова пасылаюць у Петраград на кулямётныя курсы. Ён горача ўспрымае падзеі Лютаўскай рэвалюцыі, знаёміцца з бальшавікамі і ў маі 1917 года ўступае ў ленінскую партыю. Сярод беларусаў, якія працавалі на заводах Петраграда, служылі ў арміі і флоце, Аляксандр Рыгоравіч вядзе актыўную рэвалюцыйную прапаганду. Пад яго кіраўніцтвам бальшавікі раскалолі так званую «Беларускую сацыялістычную грамаду» і яе левае рэвалюцыйнае крыло схілілі на свой бок. Беларускія камуністы прынялі актыўны ўдзел у Кастрычніцкай рэвалюцыі, у разгроме войск Керанскага — Краснова, у абароне Петраграда ад нямецкіх імперыялістаў.

14 лютага 1918 года Чарвякоў назначаецца камісарам па беларускіх справах пры Саўнаркоме РСФСР. Гэта быў Беларускі нацыянальны камісарыят, які працаваў у Петраградзе, а потым у Маскве на правах аддзела Народнага камісарыята па справах нацыянальнасцей.

Летам 1918 года Аляксандр Рыгоравіч па партыйнай мабілізацыі накіроўваецца ў Чырвоную Армію, назначаецца камісарам дывізіі, потым начальнікам аддзела Усерасійскага бюро ваенных камісараў. Пры яго ўдзеле распрацоўваюцца першыя палажэнні аб палітычнай рабоце ў Чырвонай Арміі. Адначасова ён вядзе партыйную работу як член беларускага бюро ЦК РКП(б).

Чарвякоў прымаў актыўны ўдзел у падрыхтоўцы гістарычнага акта абвяшчэння Беларускай ССР, падпісаў Маніфест аб гэтай падзеі. У першым беларускім савецкім урадзе ён быў камісарам асветы. Пад яго непасрэдным кіраўніцтвам у 1919 годзе народная асвета Беларусі рабіла свае першыя крокі. Тады ж ён выбіраецца членам ЦБ КП(б)Б, а на I з'ездзе Саветаў БССР — членам ЦВК БССР, а потым членам ЦВК Літоўска-Беларускай ССР, назначаецца членам Мінскага губрэўкома і намеснікам наркома асветы Літвы і Беларусі.

У 1919—1920 гг. Чарвякоў знаходзіўся ў



Аляксандр Рыгоравіч Чарвякоў на трэцім пленуме Цэнтральнага Савета Беларускага таварыства «Прэч непісьменнасць». 1928 г.

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы

**М. КАМІНСКІ.**

Прэзідэнцкая бібліятэка Рэспублікі Беларусь